інструментальнага выканання ў час працы па расшыфроўцы гуказапісаў фальклору.

Выкарыстанне ў навучальным працэсе асноўных прынцыпаў фальклорнай творчасці дазволіць падрыхтаваць у адпаведнасці з сённяшнімі задачамі засваення фальклору спецыялістаў, здольных правільна разумець унікальнасць народнай творчасці, спецыялістаў, якія ўмеюць зберагчы гэтую якасць фальклору ва ўмовах сучаснага самадзейнага калектыву.

Галіцкая Н.П.,
ст.выкладчык

## МУЗЫЧНАЯ ДЫКТОЎКА - АДЗІН З АСНОЎНЫХ СРОДКАЎ ВЫХАВАННЯ МУЗЫЧНАГА СЛЫХУ Ў СТУДЭНТАЎ

Музычная дыктоўка ў курсе сальфеджыо, безумоўна, з'яўляецца адным з вядучых сродкаў развіцця музычнага слыху.

На пачатковых занятках неабходна выявіць, які з фактараў - гукавысотнасць, рытм ці памяць - найменш засвоены групай ,і потым ужо настойліва працаваць у тым ці іншым напрамку. Неабходна навучыць студэнтаў інтанацыйна-структурнаму аналізу. Правільнаму запісу дыктоўкі спрыяе веданне асноўных сродкаў меладычнага развіцця - паўтораў і кантрасту.

Значна палягчае запіс дыктоўкі практычнае выкарыстанне пры гэтым ведаў музычна-сінтаксічных структур ад квадратнасці і сіметрыі да асіметрычнай пабудовы перыяду.

Пасля запісу дыктоўкі магчыма правядзенне сумеснага слыхавога аналізу: колькасць сказаў у мелодыцы, падобнасць ці яе адсутнасць у асобных фрагментаў дыктуемага матэрыялу, выяўленне найбольш цяжкіх для запісу музычных частак, патрабуючых асаблівай увагі. Вельмі карысна пры гэтым паказаць на дошцы схему пабудовы перыяду.

Адной з праблем у музычных дыктоўках з'яўляецца запіс рытму, асабліва пры мелізматычным тыпе мелодыкі. Пры гэтым часцей за ўсе назіраецца асаблівая дэталізацыя рытмікі ў межах асноўнай долі: пункцірны рытм, унутрыдолевыя сінкопы, няцотнае драбленне долі і інш.

Значнае месца ў працэсе развіцця музычнага слыху мае не толькі аналітычная памяць, але ж і інтуітыўная, не звязаная з лагічна-аналітычнымі слыхавымі аперацыямі. Прыклады для дыктовак павінны быць заўсёды высокамастацкімі па сваім змесце.

Усе гэта, безумоўна, будзе спрыяць поспеху ў запісе музычнай дыктоўкі ў курсе сальфеджыо.

Халзінская Н.М.,
выкладчык

## ВЫВУЧЭННЕ СУЧАСНАЙ МУЗЫКІ Ў КУРСЕ ГАРМОНІІ

Курс гармоніі ў ВНУ прадугледжвае працяг і значнае паглыбленне матэрыялу па гэтым прадмеце, які вывучаўся ў вучылішчы. Апрача засваення багацця класічнай гармоніі, значнае месца ў курсе вышэйшай навучальнай установы адводзіцца высвятленню асноўных тэндэнцый развіцця гарманічнай мовы музыкі XX ст. Гэта неабходна для паўнацэннага ўспрымання і інтэрпрэтацыі сучаснай музыкі.

Вырашэнне вучэбных задач курса павінна знаходзіцца ў цеснай сувязі з логікай гістарычнага працэсу развіцця музычнага мастацтва. Таму разгляду сучасных з'яў гарманічнай мовы папярэднічае вывучэнне класічнай і рамантычнай гармоніі. Асаблівасці гармоніі XX ст. - развіццё класічнай гарманічнай сістэмы і з'яўленне прынцыпова новых якасцей у музычнай мове. У працэсе вывучэння тэм, звязаных з класічнай і рамантычнай гармоніяй, паступова ўводзяцца паняцці, тэрміны, музычны матэрыял сучаснай музыкі. Напрыклад, вывучэнне тэмы «Неакордавыя гукі» ўзбагачаецца разглядам узораў актыўнага ўзаемадзеяння розных формаў і відаў неакордавых гукаў у поліфанізаванай фактуры музыкі XX ст.

У новай праграме па гармоніі, распрацаванай выкладчыкамі кафедры тэорыі музыкі Беларускага універсітэта культуры, вывучэнню з'яў гарманічнай мовы XX ст. адводзіцца немалая колькасць гадзін (практычна гэта амаль цэлы семестр). Так, тэма N 15 прысвечана гістарычнаму працэсу засваення храматыкі, агляду відаў храматычных структур у музыцы другой паловы XIX - XX ст. Асноўная ўвага звяртаецца на паступовасць працэсу канцэнтрацыі храматыкі, узрастанню ролі фанізму, альтэрацыйнасці і інш. Тэма N 26 - заключная тэма курса - пашырае ўяўленні студэнтаў аб гармоніі XX ст. і знаёміць іх з шэрагам новых з'яў музычнай мовы. Студэнты атрымліваюць веды аб адзінках гарманічнай мовы ў музыцы XX ст., аб эвалюцыі ладатанальных сістэм, з'явах політанальнасці, атанальнасці, аб такіх кампазіцыйных тэхніках другой паловы нашага стагоддзя, як серыйнасць, серыяльнасць, алеаторыка, санарыстыка, мікрахраматыка, полістылістыка.

Вывучэнне сучаснай музыкі адбываецца пры засваенні тэарэтычных звестак; вусным гарманічным аналізе узораў тэхнікі кампазіцыі XX ст.; слуханні твораў (альбо ўрыўкаў) сучасных беларускіх, рускіх, замежных кампазітараў; пісьмовай пабудове акордаў нетэрцовай структуры; спробах непасрэднага

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

праніknення ў стылявую сістэму сучаснай гарманічнай мовы шляхам дасачынення па дадзенаму ўзору перыядаў ці іншых формаў з характэрнымі рысамі акордыкі і танальнасці.

Асноўнай формай работы пры азнаямленні з сучаснай музыкай з'яўляецца гарманічны аналіз. У якасці прыкладаў для аналізу неабходна выкарыстоўваць і творы беларускіх аўтараў (напрыклад, «Ціль Уленшпігель» Глебава як узор ужывання сіметрычных ладоў і мажора-мінорнай сістэмы, «Попел», «Капрычос» Картэса пры знаемстве з серыйнай тэхнікай і г.д.). Гэта не толькі значна пашырае веды студэнтаў аб сучаснай беларускай музыцы, але і дапамагае ўспрыманню беларускай музычнай культуры як часткі сусветнай культуры, у многім сугучнай агульнаму працэсу развіцця выразных сродкаў (у тым ліку гармоніі) у музыцы XX стагоддзя.

Клімовіч Л.А.,
аспірантка

## АСАБЛІВАСЦІ ВУЧЭБНА-ТВОРЧАЙ РАБОТЫ Ў ДЗІЦЯЧЫМ ХОРЫ

Вучэбна-творчая работа ў дзіцячым хоры мае свае спецыфічныя асаблівасці ў параўнанні з работай у хоры для дарослых. Гэта спецыфіка абумоўлена перш за ўсе тым, што дзіцячы арганізм у адрозненне ад дарослага знаходзіцца у бесперапынным развіцці і змяненні. Так, дзеці ва ўзросце дзевяці гадоў фізічна больш моцныя і дужыя, чым дзеці 7-8 гадоў. Хуткі фізічны рост характарызуецца імкненнем да руху, таму дзеці становяцца больш непаседлівымі. Розняцца дзеці і ў разумовым развіцці. У трэцім класе дыферэнцыяцыя дзяцей па інтарэсах становіцца больш відавочнай, чым у першым і другім класах. У гэтым узросце ў дзяцей з'яўляецца імкненне «вылучыць сябе». Гэта імкненне неабходна правільна накіраваць. Педагогу трэба добра ведаць індывідуальныя рысы выхаванцаў і праводзіць вучэбна-творчую работу ў адпаведнасці з псіхафізічнымі асаблівасцямі дзяцей розных па ўзросту груп.

Ствараючы дзіцячы хор, неабходна прытрымлівацца аднароднасці складу калектыву па ўзросту. Найбольшы вынік дае работа з такім хорам, які развіваецца на працягу рэгулярных заняткаў, пачынаючы з малодшага ўзросту і да старэйшага. Прайшоўшы такую школу харавых спеваў, дзеці на ўсе жыццё захоўваюць любоў да іх і працягваюць заняткі ў гэтым напрамку.

Пасля вывучэння літаратуры па дадзенаму пытанню і вопыту работы з дзецьмі вядомых майстраў быў арганізаваны дзіцячы харавы калектыў «Вясёлка» з двух трэціх класаў у сярэдняй школе N 17 з музычна-харавым ухілам г.Брэста. У ім займаецца 50 чалавек, сярэдні ўзрост дзяцей - 9 гадоў. Заняткі праводзяцца сістэматычна два разы ў тыдзень на працягу двух гадоў.

На першым годзе навучання асаблівая ўвага ўдзялялася развіццю вакальна-харавых навыкаў пры рабоце над аднагалоссем, у другі год работа была сканцэнтравана над двухгалоссем.

У пачатку навучання мы выявілі недасканала інтанаваных дзяцей, з якімі праводзіліся індывідуальныя заняткі.

Як вядома, асновай харавых спеваў з'яўляецца вакальна-харавая тэхніка. Ад заняткаў да заняткаў работа па яе развіццю ўскладнялася, рабілася больш разнастайнай і цікавай. Асноўны змест работы над развіццем вакальных навыкаў прадугледжваў наступнае: а) правільнае дыханне, б) гукаўтварэнне, в) правільную дыкцыю і артыкуляцыю, развіццё харавых навыкаў у рабоце над інтанацыяй, строем і ансамблем.

Кіраўніку хору дзяцей малодшага ўзросту неабходна памятаць, што музычную падрыхтоўку не варта зводзіць да аднаго толькі вывучэння нот і дакладнага інтанавання. Дзяцей патрэбна навучаць слухаць і выконваць музычныя творы, удумліва ўслухоўвацца ў вобразы. Іншымі словамі, неабходна дабіцца творчай актыўнасці кожнага навучэнца. Лепшы спосаб для гэтага - гульня. Напрыклад, вядома, што для фарміравання вакальных навыкаў неабходна сістэматычна выкарыстоўваць вакальныя практыкаванні. Каб зрабіць гэту работу больш цікавай, можна прапанаваць дзецям гульню пад назвай «У лесе». Досыць папрасіць іх уявіць, што яны заблудзіліся ў лесе. «Як вы будзеце клікаць адзін аднаго?» - пытаецца настаўнік. Дзеці адразу адказваюць: «Ау!» Педагог прапануе ім гэта праспяваць. Пытаннямі: «Якія птушкі сустракаюцца ў лесе?», «Як яны спяваюць?» - ён накіроўвае дзяцей на думку, што яны самі могуць складаць практыкаванні. Можна паказаць ім, як вар'іраваць рытм, інтанацыю. Праца над практыкаваннямі, якія складаюць самі дзеці, садзейнічае развіццю іх творчай фантазіі.

Пякуцька А.В.,
дацэнт,
Мухортава А.Я.,
суіскальнік

## ДУХОЎНАЯ ХАРАВАЯ МУЗЫКА Ў ЗМЕСЦЕ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ

Пеўчая харавая справа - гэта не вузкаспецыяльная праблема музыкантаў-прафесіяналаў,



РЕПОЗИТОРИЙ БрГУ